## ЗНАЁМСТВА З ЦАЦКАЙ “МЯДЗВЕДЗЬ”

З вобразам мядзведзя малыя знаёмяцца ў беларускіх народных казках «Дзедава рукавічка», «Пра быка і яго сяброў», «Як кот звяроў напалохаў». Сярод звяроў паводле старшынства мядзведзь займае першую пазіцыю (у беларускай прасторы) або другую, саступаючы месца льву, калі размова ідзее пра абодвух звяроў. У некаторых казках выяўяецца супрацьпастаўленасць мядзведзя ваўку, хаця ў іншых сітуацыях яны дзейн1чаюць супольна з іншымі звярамі, дапамагаючы галоўнаму герою.

Вобраз мядзведзя падаецца ў забаўлянках «У куце сядзіць мядзведзь, «Сядзіць мядзведзь на калодзе...», у фальклорных і лггаратурных творах «Колобок» (обраб. К. Ушинского), «Теремок» (об-раб. М. Булатова), «Маша и медведь» (обраб. М. Булатова), «Зимовье зверей» (обраб. И. Соколова-Микитова), «Мядзведзь» А. Якімов1ча, «Три медведя» Л. Толстого, «Медвежата» Е. Чарушина.

Гэтая цацка зроблена з гліны або з пластмасы. Яе роспіс нагадвае роспісы беларусюх народных цацак. Мядзведзя можна зрабіць з меху. Яго можна апрануць у аздобленую беларускім арнаментам кашулю і падперазаць поясам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ





**Рис. 11**

## Расказванне казкі “ Селянін, мядзведзь і лісіца”

**Мэта:** развіваць у дзяцей уменне эмацыянальна ўспрымаць казку, разумець змест казачнага тэксту, адчуваць маляўнічасць казачных вобразаў. Развіваць у выхаванцаў навыкі звязнага маўлення.

**Матэрыл**: цацка мядзведзь.

**Ход.**

Разглядванне цацкі. Апісанне цацкі выхаванцамі. Расказванне казкі педагогам.

Размова пасля расказвання.

- Апішыце мядзведзя. Які ён ў казцы.
- Ці падобны мядзведзь ў казцы на мядзведзя-цацку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ